# РОДНОЙ И ИНОСТРАННЫЕ ЯЗЫКИ КАК СРЕДСТВО КОММУНИКАЦИИ В ПРОФЕССИОНАЛЬНОЙ СФЕРЕ

УДК 811

## АСНОЎНЫЯ АСПЕКТЫ НАВУЧАННЯ СТЫЛІСТЫЦЫ

***Агароднікава Святлана Васільеўна***
*старшы выкладчык*
*Беларускі дзяржаўны эканамічны ўніверсітэт*
*Мінск, Беларусь*

## BASIC ASPECTS OF TEACHING STYLISTICS

***Ogorodnikova Svetlana***
*Senior Teacher*
*Belarus State Economic University*
*Minsk, Republic of Belarus*

Полесгу

**Анатацыя:** У артыкуле разглядаюцца метады і прыёмы, выкарыстанне якіх садзейнічае авалоданню ўнармаванымі лексічнымі сродкамі. Даецца падрабязны аналіз спецыфічных прынцыпаў методыкі навучання стылістыцы, засяроджваецца ўвага на неабходнасці іх узаемадзеяння. У выніку адзначаецца важнасць правільнага выбару выкладчыкам метадаў і прыёмаў пры навучанні стылістыцы.

**Abstract:** The article considers methods and techniques used for mastering normalized lexical means. Detailed analysis of specific principles of the methods of teaching stylistics is given, and attention is focused on necessity of their interaction. Finally, the importance of correct choice by a teacher of methods and techniques of teaching stylistics is noted.

**Ключавыя словы:** метады; прыёмы; прынцыпы; стылістыка; кантэкст; функцыянальны стыль.

**Keywords:** methods; techniques; principles; stylistics; functional; context.

Навуковыя асновы навучання стылістыцы ў методыцы складаюць прынцыпы, метады і прыёмы.

Аноўную ролю ў навуковых асновах навучання стылістыцы адыгрываюць прынцыпы, пад якімі трэба разумець тыя тэарэтычныя палажэнні, якімі павінен кіравацца выкладчык пры выбары дыдактычнага матэрыялу, метадаў і прыёмаў арганізацыі навучання ўвогуле беларускай мове і ў прыватнасці стылістыцы.

У аснове навучання стылістыцы ляжаць агульнадыдактычныя, прыватнаметадычныя і спецыфічныя прынцыпы.

Да спецыфічных прынцыпаў методыкі навучання стылістыцы адносяцца:

1. Прынцып узаемасувязі вывучэння стылістыцы з іншымі раздзеламі навукі аб мове.

Арганічная сувязь стылістыкі з фанетыкай, лексікай, словаўтварэннем, граматыкай выцякае з самой сутнасці прадмета стылістыкі, якая вывучае будову мовы, яе сістэму ў функцыянаванні. На занятках “паралельнага” вывучэння раздзелаў курса мовы і стылістыкі неабходна ажыццяўляць функцыянальна–стылістычны падыход, паказваць, выяўляць функцыянаванне моўных сродкаў.

Напрыклад, пры вывучэнні зычных гукаў і іх характарыстыцы добра заўважаць, скіроўваць увагу студэнтаў на вызначэнне стылістычнай ролі тых ці іншых гукаў, іх ужывання, для чаго выкарыстоўваюцца спецыяльныя практыкаванні наступнага тыпу: *Назавіце шыпячыя і свісцячыя гукі і вызначце іх ролю ў тэксце. Якія гукі паўтараюцца і якая іх роля?*

2. Прынцыпы кантэкстнага разгляду стылістычных сродкаў.

Стылістычныя сродкі найбольш поўна (а часм і толькі) праяўляюцца не ізалявана, а ў пэўным кантэксце. Менавіта ў гэтым і заключаецца дадзены прынцып. І такі падыход абумоўлены спецыфікай навукі, што займаецца адборам моўных сродкаў і іх выкарыстання ў пэўнай сферы зносін.

Кантэкст падзяляецца на мікратэкст (сказ), макратэкст (абзац) і тэкст, дзе адпаведна выяўляюцца прыкметы лексемы, словаформы (у сказе), сказа, слова і словаформы (у абзацы), абзаца, сказа, слова і словаформы (у тэксце).

У сувязі з гэтым прынцыпам асаблівае значэнне набывае падбор дыдактычнага матэрыялу, які ўяўляў бы сабой тэкст або асобнае выказванне для ілюстрацыі цэласнасці камунікатыўнага акта. І, як падкрэсліваюць даследчыкі, прынцыповым у сувязі з гэтым з’яўляецца не проста адбор, а “адбор тыпізаваных кантэкстаў, якія сустракаюцца ў маўленчым акце”. Рэалізацыя прынцыпаў кантэкстнага разгляду стылістычных сродкаў адкрывае новыя магчымасці арганізацыі

Полесгу

маўленчай дзейнасці студэнтаў, а таму выкладчыкам важна ўсвядоміць яго і кіравацца ім у сваёй практычнай дзейнасці.

3. Прынцып уліку стылістычных нормаў і магчымасці – немагчымасці адхіленняў ад гэтых нормаў патрабуе разгляду пэўных тэкстаў з пункту гледжання суадноснасці зместу і яго афармлення. Студэнты павінны ўсвядоміць, што захаванне нормаў літаратурнай мовы з’яўляецца абавязковым для жанраў усіх функцыянальных стыляў. Выкладкі матываванага і нематываванага выкарыстання моўных сродкаў неабходна разглядаць з пазіцый асобнага стылю. Так, ужыванне прастамоўных слоў дапускаецца нормамі гутарковага стылю, але ў навуковым і афіцыйна–справавым ні ў якім разе, а ў мастацкім – толькі з пэўнымі мэтамі. Ва ўсякім разе адхіленні ва ўжыванні слова, словаформы, сінтаксічнай канструкцыі ўсведамляюцца на аснове нормаў мовы, і ў гэтым заключаецца арыентацыя на адзіную сістэму літаратурнай мовы.

На практыцы ўсе тры прынцыпы ўзаемадзейнічаюць, а ўлік іх напрамкаў у працы выкладчыка дапаможа правільна выбраць метады і прыёмы пры навучанні стылістыцы.

**Спіс літаратуры**

1. Колшанский, Г. В. Контекстная семантика / Г. В. Колшанский. – М. : Наука, 1980. – 149 с.

2. Трофимова, Г. К. Русский язык и культура речи: курс лекций / Г. К. Трофимова. – 5–е изд. – М. : Флинта : Наука, 2007. – 160 с.

3. Беларуская мова: Цяжкія пытанні фанетыкі, арфаграфіі, граматыкі / А. І. Падлужны, Л. Ц. Выгонная, Г. К. Усціновіч і інш.; Пад рэд. А. І. Падлужнага. – Мн. : Нар. асвета, 1987. – 144 с.

Полесгу